# ЛЮБІМЫЯ  КНІГІ ЛЮБІМЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ

7 снежня адбылася творчая сустрэча гродзенскіх пісьменніц Л.А. Кебіч і Г. І. Скаржынскай-Савіцкай з вучнямі 4-х класаў СШ №6 г. Гродна. Тэма “Любімыя кнігі любімых пісьменнікаў”.

Дзеці з захапленнем слухалі творы пісьменніц. Людміла Антонаўна пазнаёміла вучняў са сваёй новай кніжкай “Игрушки для Валюшки”. Зарад пазітыўнай энергіі вучні атрымалі ад яе вясёлых, захапляльных вершаў. А яшчэ больш – ад загадак. Каб даць адказ на многія з іх, вядома, трэба было падумаць. Таму вучні працавалі эмацыянальна, з запалам – кожнаму хацелася адгадаць першым.

Ганна Скаржынская-Савіцкая запрасіла ў навагоднюю казку “Как ребята Деда Мороза спасали”, прыгоды ў якой адбываюцца ў маёнтку Дзеда Мароза, што знаходзіцца ў Белавежскай пушчы.

Асаблівую цікавасць вучняў і не меншую – настаўнікаў, выклікала апошняя кніга пісьменніцы “Сказка о волшебном путешествии в мир воды”. Пад час знаёмства з якой Ганна Іосіфаўна разам з гераіняй казкі Чыстай Кропелькай паклікала слухачоў у чароўны свет вады, а Вадазнайка расказаў адкуль ў нашы кватэры паступае вада. У другой частцы казкі Брудная Кропелька расказала аб тым, як яна ачышчаецца пасля каналізацыі. Падчас знаёмства з кнігай узніклі пытанні, на якія пісьменніца адказала, прачытаўшы ўрыўкі з казкі.

І, вядома ж, паэткі падарылі вучням вершы прысвечаныя малой радзіме, зімовым забавам.

Сустрэча прайшла цікава і запамінальна. На працягу мерапрыемства вучні чыталі свае любімыя вершы пра радзіму, мову. На развітанне жадаючыя набылі кнігі з аўтографамі ад аўтараў, разам сфатаграфаваліся на памяць.




Гродно – город королей
Расінка
КАЗКІ-ЧАПАЧКІ



